# Даніэль
## (Cevrus dama)

“Вось сымбаль твой, забыты краю родны!”*



** Паводле газэты “Наша Ніва”.*

Да прыезду эўрапейцаў у Новай Зэляндыі практычна не было сысуноў. Капітан Кук завёз у гэтыя краі сьвіней і козаў. Першых аленяў у Новую Зэляндыю прывезьлі ў 1851 г. Сёньня на выспах жыве больш за дзесяць відаў аленяў з розных краёў сьвету. Апроч высакароднага аленя (Cevrus elaphus), плямістага, белахвостага ды іншых, тут жывуць і ласі, і даніэлі. ...Новазэляндзкія паляўнічыя забясьпечаныя здабычаю, пра якую толькі мараць іх калегі на Беларусі.

А некалі даніэлі былі звычайнымі жыхарамі беларускіх лясоў. Пасьля далучэньня да Расеі, на прыканцы XVIII ст., яны былі цалкам вынішчаныя. Потым, дзеля царскага паляваньня, неаднаразова завозілі даніэляў у Белавескую пушчу. Тут перад пачаткам першай сусьветнай вайны іх налічвалася блізу 1,5 тысячаў галоў.

« адгарні

Але па вайне іх зноў ня стала.
Пры Польшчы, у 1932 г., зь Нямеччыны было завезена 8 асобін даніэляў у Налібоцкую пушчу. Тутака быў нават створаны адмыслова так званы Вялаўскі запаведнік, дзе ў мясьцінах свайго спрадвечнага йснаваньня даніэлі хутка разьвяліся.
Ізноў вайна. У Налібоцкіх лясох месьціўся Баранавіцкі падпольны абкам КП(б)Б і штаб Баранавіцкага партызанскага злучэньня. І даніэляў зноў ня стала.
Пры Саветах, у 1951 г. скасавалі й Вялаўскі запаведнік. Пра даніэляў у Налібоцкай пушчы цяпер не чуваць.
У 1963 г. у Белавескую пушчу завозілі гэтых жывёлаў з Польшчы. Але ўжо марна. Даніэляў не аднавілі. Між тым, ва ўсіх суседніх зь Беларусяй дзяржавах папуляцыі адноўленыя.
Чым жа адметная гэта жывёла?
Па-першае, у адрозьненьне ад, скажам, ласёў, альбо высакародных аленяў, рогі носяць ня тольскі самцы даніэляў, але й самкі. Рогі ў іх круглыя, складаюцца зь дзьвюх галінаў, якія пашыраюцца ўгору і ўтвараюць лапаткі (кшталтам як у ласёў), па краёх якіх вострыя парасткі, што загнутыя і ўперад, і назад.
А па-другое, гэта найпрыгажэйшая жывёла з нашых парнакапытных. Яе грацыя й пекнасьць былі папулярныя ў любоўнай лірыцы розных народаў.
Даніэлі крыху меншыя за іншых аленяў: маюць даўжыню 1,5–1,6 м, а вышыню ў карку каля 1 м. Поўсьць па сьпіне й па баках ружова-бурая з радамі бела-жоўтых плямаў, каля хваста й трыбуха — даўжэйшая й белая. Самкі з маладняком трымаюцца статкамі да 10 жывёлін.
Натуральна, для такіх істотаў апроч густога мяшанага лесу патрэбныя й выганы, шырокія паляны, просекі. Даніэлі скачуць, бегаюць і плаваюць.
На жаль, што такое "…як даніэль…" сёньня беларусам даводзіцца тлумачыць хіба што па кнігах.

*S.H.*

**© Zialony kraj/Зялёны край** часапіс — **№1(5)-2000**.
Супольны праект Групы «ЭкаІнформ» і Выдавецтва «Zielone Brygady» у абмене інфармацыяй экалягічнай.
Падтрыманы Фундацыяй імя Стэфана Баторага (Варшава) / Фундацыяй Сораша.
Наклад: 299,99 паасобнікаў :-) . Надрукаваны ў добрай друкарні. Распаўсюд вольны.
Адрэса для допісаў: а/с 68, 220047, Менск, Беларусь. E-mail: **zialonykraj@europe.com**
Каардынатарам зь беларускага боку й рэдактарам Максім Капран, каардынатарам з польскага боку Станіслаў Гурка. Мастацкая рэдактарка й варштаўніца Эла Мацьвіенка. Карэктар Аляксей Чарняеў.